Весці БДПУ. Серыя 1. 2024. № 4. С. 127–130

УДК: 821.161.3:82-31 Э.Ажэшка

# МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ГУМАНІСТЫЧНЫХ ПОГЛЯДАЎ Э. АЖЭШКІ Ў АПАВЯДАННІ «ЗІМОВЫМ ВЕЧАРАМ»

**Л. П. Леська,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 27.06.2024.

UDC: 821.161.3

# ARTISTIC EMBODIMENT OF HUMANISTIC VIEWS IN BY E. OZHESHKO THE STORY «WINTER EVENING»

**L. Leska,**
*Candidate of Philological Sciences, Associate Professor of the Department of Belarusian and Foreign Literature of Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 27.06.2024.

У артыкуле даследуецца спецыфіка мастацкага выяўлення гуманістычных поглядаў Э. Ажэшкі ў апавяданні «Зімовым вечарам».
Вывучаюцца цэнтральныя каардынаты мастацкай канцэпцыі твора – катэгорыі святла і цемры, пейзажныя замалеўкі, хранатапічныя характарыстыкі і дэталі партрэтаў, аспекты аўтарскай мастацкай анамастыкі.
Разглядаюцца вобразы дзяцей і філасофска-рэлігійная катэгорыя «дзіцячае».

*Ключавыя словы:* Э. Ажэшка, гуманізм, святло і цемра, вобраз дзіцяці.

The article examines the specifics of the artistic identification of E. Ozheshko's humanistic views in the story «winter evening». The central coordinates of the artistic concept of the work are studied -the categories of light and darkness, landscape sketches, chronotapic characteristics and details of needs, aspects of the author's artistic onomastics.
The images of children and the philosophical and religious category of «children» are considered. Keywords: E. Ozheshko, humanism, light and darkness, the image of a of a child.

*Keywords:* E. Ozheshko, humanism, light and darkness, the image of a child.

Канец XX і пачатак XXI ст. пазначаны маштабнымі катаклізмамі, дэфармацыяй каштоўнасных арыенціраў, сацыяльным, маральным, эканамічным і інтэлектуальным хаосам, генацыдам у адносінах да шэрагу народаў.

Глыбокія змены ў сучасным свеце выклікалі зацікаўленасць механізмамі ўзнаўлення гуманістычных ідэалаў. У сувязі з пераацэнкай сучаснага жыцця актуальным становіцца вывучэнне творчай спадчыны Э. Ажэшкі, галоўным пафасам творчасці якой з'яўляецца «палкі гуманізм і боль за чалавека» [1, с. 81].

Мэта дадзенага артыкула – прасачыць спецыфіку мастацкага выяўлення гуманістычных поглядаў пісьменніцы на матэрыяле апавядання «Зімовым вечарам».

Вывучэнню гуманізму, гуманістычных поглядаў мастакоў слова надаецца павышаная ўвага ў замежнай і айчыннай навуковай літаратуры. Гістарычныя аспекты развіцця гуманізму ў розныя эпохі і сацыякультурныя сістэмы знайшлі месца ў працах В. Зянькоўскага, У. Салаў'ёва, У. Конана. У рэчышчы традыцыйнага матэрыялістычнага светапогляду гуманізм даследуецца В. Лявонцьевым, Т. Ярашэўскім, як касмалагічны феномен – Я. Спірыным, рэлігійны характар гуманізму абмяркоўваецца ў працах А. Амелінай. Агульныя характарыстыкі і адрозныя падыходы да гуманізму ёсць у працах П. Гурэвіча.[1]

Паняцце гуманізму ў філасофскіх і гісторыка-літаратурных даследаваннях выкарыстоўваецца ў розных значэннях: гуманізм як маральна-эстэтычны і культурны рух эпохі Асветніцтва; «гуманізм як агульнафіласофская катэгорыя, якая абазначае найперш за ўсё такую ж сістэму поглядаў, у якой чалавечая асоба з'яўляецца асноўнай каштоўнасцю свету» [2]. Гуманізм у літаратуры – гэта сцвярджэнне чалавечага ў чалавеку, разуменне чалавека як носьбіта найвышэйшых чалавечых якасцей.

Гуманістычныя погляды Э. Ажэшкі, паводле слушных заўваг В. Гапавай, ярка адбіліся ў творах пісьменніцы 80-х гг. XIX ст. У час найвышэйшага ўздыму творчасці знакамітай «каралевы слова» быў створаны «беларускі цыкл» апавяданняў і аповесцяў з жыцця народа (аповесці «Нізіны», «Дзюрдзі», «Хам», апавяданні «Рэха», «Зімовым вечарам», «Тадэвуш»), якія, паводле слоў Т. Салдаценкі, з'яўляюцца «найбольш значнымымі ў ідэйных і мастацкіх адносінах творамі

[1] Зеньковский, В. Гуманизм и психология в педагогике / В. Зеньковский. – М. : Издательство «Амрита», 2020 – 272 с.; Соловьев, В. С. Собрание сочинений и писем : в 15 т. / под ред. С. М. Соловьева, Э. Л. Радлова. – М. : ПАИМС, 1992. – 1010 с.; Проблемы гуманизма в марксистско-ленинской философии: (История и современность) / Т. М. Ярошевский, Л. Н. Суворов. – М. : Политиздат, 1975. – 304 с.; Конан, У. М. Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917–1934 гг.) / У. М. Конан ; навук. рэд. К. К. Атраховіч (Крапіва); АН БССР, Ін-т філасофіі і права. – Мінск : «Навука і тэхніка», 1968. – 187 с.; Спирин, Е. А. Феномен человека как система антропокосмической целостности: дис. ... канд. философ. наук : 09.00.11. — Новосибирск, 1999. – 253 с.; Гуревич, П. Философия культуры: Пособие для гуманит. Вузов / П. Гуревич. – М. : АОА «Аспект-Пресс», 1994. – 316 с.

Э. Ажэшкі <…> і аб'яноўваюцца паміж сабою агульнай тэматыкай і праблематыкай, ідэйна-эстэтычнымі тэндэнцыямі і мастацкімі асаблівасцямі» [3, с. 3]. «Сапраўды наватарскім у “беларускім цыкле” было глыбокае даследаванне жыцця беларусаў, мастацкае пранікненне ў духоўны свет чалавека, якому было суджана заваяваць права грамадзянства ў літаратуры» [3, с. 11].

Для Э. Ажэшкі, паводле бачання даследчыцы жыццёвага і творчага шляху пісьменніцы В. Гапавай, засталіся «“ад маладосці пазітывізму” непарушнымі на ўсё жыццё вера ў сілу ведаў, навукі, працы, імкненне да асветы народа і маральнага ўдасканалення чалавека» [4, с. 81].

Ідэі духоўнага адраджэння чалавека, рэалізаваныя ў творчасці Э. Ажэшкі, на думку айчыннага даследчыка У. Навумовіча, «чэрпаюць» свае вытокі ў творчай спадчыне Л. М. Талстога. У артыкуле «Прыцягальная сіла класікі. Аповесць “Хам” Элізы Ажэшкі» вучоны заўважае, што *«выдатнай <…> пісьменніцы Элізы Ажэшкі не стала ў той самы год, калі памёр Леў Талстой, “ля падножжа якога”, па вобразным выказванні літаратуразнаўцы Алеся Адамовіча, узрасталі, уздымаліся многія мастакі слова іншых краін і народаў. Леў Талстой быў адным з настаўнікаў пісьменніцы, якая наследавала яго вучэнне аб паляпшэнні душы»* [5, с. 7].

Ідэя чалавекалюбства адлюстравана ў адным з самых папулярных апавяданняў Э. Ажэшкі 80-х гг. XIX ст. – «Зімовым вечарам». У гэтым творы пісьменніца асэнсавала дыялектыку дабра і зла і акрэсліла ўмоўны сцэнарыйператварэння-выпраўлення героя.

Цэнтральнымі каардынатамі мастацкай канцэпцыі апавядання «Зімовым вечарам» з'яўляюцца катэгорыі цемры і святла[1], праявы якіх вылучаюцца ў хранатопе, у пейзажных замалёўках, у асобных дэталях партрэтаў герояў. Гульня святу і ценю сталі дамінуючымі пры раскрыцці тэмы дзяцінства і вобразаў дзяцей.

На пачатку апавядання «Зімовым вечарам» прадстаўлены малюнак завірушнага хаосу, у якім і рухаецца невядомы чалавек: *«На хмарным небе – аніводнай зорачкі. Вецер вірыў над самай зямлёю, слупамі ўздымаўся ўгару, шумам і енкам свістаў у глыбокай катлавіне, на дне якой праходзіў роўны, шырокі шлях замерзлай ракі. Рака з яе нізкімі берагамі і высокія адкосы лавіны ледзь-ледзь прасвечвалі праз імглу цьмянай бель снегу»* [6, с. 13].

Падарожны не ведае, куды ідзе, перад ім «шлях замерзлай ракі» і на фоне *«цьмянай белі снегу яго постаць здавалася тонкай чорнай рысачкай, якая была нават цямней за акаляючую цемру»* [6, с. 13]. Здавалася, што гэта беспрасветная цемень і тонкі чорны абрыс чалавека, чарнейшы за акаляючае наваколле – знак немагчымасці павярнуць да лепшага. Але гэта не так, таму што ў фінале апавядання Э. Ажэшка змясціла ізноў падобную пейзажную замалёўку цёмнай начы, рух самотнага чалавека, але цяпер *«на цьмяным фоне снегу ён быў падобны на тонкую рысу, якая хутка перасякала густую, аднак не такую чорную, як яна, цемру»* [6, с. 34]. Адзінае тонкае аўтарскае ўдакладненне-параўнанне наконт ступені чарнаты самога чалавека на фоне гэтай цемені белага свету стала сімвалічным сведчаннем, што ператварэнне злачынцы адбылося.

Выпраўленне Бонка, яго духоўнае перараджэнне ў апавяданні «Зімовым вечарам» сімвалічна адлюстравана на розных узроўнях мастацкага тэксту, адным з якіх стала вар'іраванне ўласнымі імёнамі і найменнямі героя. Галоўны персанаж апавядання «Зімовым вечарам» называецца па-рознаму: то ён – невядомы чалавек, то яго палічылі панам, гледзячы на вопратку, то ён – госць, то, адначасова ва ўспрыняцці Сымона Мікулы, ён – сын Ясік і злачынец Бонк.

Імя *Ясік* у мастацкім тэксце твора сустракаецца двойчы, акрамя галоўнага героя, так завуць і Мікулавага ўнука, магчыма, у гонар раней любага і дарагога старэйшага сына, які цяпер стаў Бонкам.

Слова «бонк» – тэрмін, якім карыстаюцца людзі ў час інтэнсіўнай актыўнасці, калі ў іх заканчваюцца сілы і ім патрэбна тэрмінова папрасіць дапамогі. Бонк – удар аб сцяну, які павінен зрабіць чалавек, губляючы фізічную моц і прысутнасць духу. У такім становішчы і апынуўся «загнаны» і стомлены герой Э. Ажэшкі, а яго сустрэча з пляменнікам Ясікам дае надзею, што ленту з ганебнымі кадрамі жыццёвай гісторыі быццам можна пераматаць і жыццё пражыць правільна.

Веру ў будучае перараджэнне вялікага грэшніка, па нашым меркаванні, пісьменніца занатавала і ў імёнах, што сустракаюцца ў біблейскай гісторыі: Сымон, Аляксей, Марыля і ў безыменнасці бондара.

Безыменнасць брата галоўнага героя стала больш яркай характарыстыкай, чым любое імя ў апавяданні «Зімовым вечарам». Факт безыменнасці ўзмацняе высокае значэнне слова «бондар» – майстар – агульнай назвы для ўсіх творцаў. Заўжды з імёнамі і прозвішчамі людзей звязвалася гісторыя іх зямнога існавання, а ў творы Э. Ажэшкі гэты момант адыходзіць на задні план, галоўным становіцца імя духу, творчай працы.

Такім чынам, ужыванне пісьменніцай розных імёнаў персанажаў твора, імёнаў і найменняў аднаго і таго ж героя (своеасаблівая аўтарская анамастыка) падпарадкавана разгляду лёсу чалавека *як адзінкі Сусвету, як удзельніка грамадскай супольнасці і як прадстаўніка роду і сям'і.*

---

[1] Святло заўсёды мела вялікае значэнне для людзей. Першабытныя людзі пакланяліся святлу, сонцу. Словы, звязаныя са святлом, у славян служылі выражэннем даброт, чыстаты, здароў'я. Цемра традыцыйна сімвалізуе спрадвечны хаос, з якога і пачалася гісторыя свету, цемрай яна і завершыцца. Спалучэнне «канец свету» павінна было азначаць наступленне цемры і рух да пазачасавасці.

На пачатку апавядання «Зімовым вечарам» выкарыстоўваецца агульная форма «чалавек». Магчыма, так Э. Ажэшка хацела падкрэсліць, што тая бяда, у якую трапіў падарожны, магла б здарыцца з кожным жыхаром вялікага свету. Аўтар паступова згушчае цемру вакол свайго героя, чорныя фарбы сімвалічна падкрэсліваюць ступень яго безабароннасці перад яго вялікасцю Сусветам: *«Прасторы ночы і адзіноты разліваліся вакол яго постаці; шумлівыя хвалі завірухі, здавалася, неслі яе па шырокім, дзікім, панурым улонні прыроды, і перад яе і пагрозамі і веліччу тая постаць была кропляй крушынкай, зярняткам пяску, каліўцам травы, якое ўпала ў бездань»* [6, с. 14]. Лёс *выпадковага чалавека, незнаёмага* чалавека становіцца яркім выражэннем хісткасці эпохі, маральнай недасканаласці грамадства.

На другім (умоўным) – *грамадскім* – узроўні Бонк не адразу атрымоўвае правільную сацыяльную ідэнтыфікацыю, спачатку, гледзячы на вопратку, героя палічылі панам, потым усе зразумелі, што перад імі страшны злачынец, забойца, памяць пра якога нельга нават увекавечваць у фотаздымках.

Грамадства выступае за жорсткае пакаранне злачынцы. Э. Ажэшка не згодна з памкненнямі большасці, яна пераканана, што за тое, што такая яркая індывідуальнасць асуджана на ганебнае існаванне (талент Ясіка, яго непадобнасць да іншых шматразова згадваецца ва ўспамінах яго бацькі Сымона Мікулы) павінна несці грамадства. Свае погляды і думкі наконт гэтай праблемы пісьменніца агучвае ў палымяных прамовах героя, у яго дыялогах з роднымі. Бонк настойліва падкрэслівае, што грамадства надзвычай жорсткае: *«Саломінкі ніхто не падасць, каб чалавек за яе ўхапіўся ды з ямы вылез. Або, калі чалавек пакаўзнецца і, як тая свіння, уваліцца ў гной, ці знойдзецца на ўсім свеце хоць адзін, што злітаваўся б над ім і вывеў на сухое месца. Ого! Ніхто нават не азірнецца, а калі і азірнецца, дык толькі каб нагою кашкануць»* [6, с. 37].

Герой Э. Ажэшкі эмацыйна тлумачыць бацьку, што самае найгоршае знаходзіцца поруч з найлепшым: *«Найгоршы, найгоршы <…> – паўтараў госць. – А ці ведаеце вы, пан гаспадар, што найгоршае бывае часам і побач блізенька каля найлепшага»* [6, с. 36]. Гэтае «найгоршае» сімвалічна ўдакладняецца ў мастацкім тэксце апавядання такімі партрэтнымі дэталямі, як чорныя агністыя вочы на панурым аброслым твары старэйшага Мікулавага сына – бондара, альбо злосць і жаданне малодшага сына Аляксея здзейсніць хуткую расправу над злачынцам.

Пісьменніца не толькі абазначае злы пачатак, але і дае магчымасць чытачу зразумець яго вытокі. Так, у хаце Сымона Мікулы жыве дванаццаць чалавек, павязаных паміж сабой сямейна-роднымі сувязямі, быццам дванаццаць апосталаў з біблейскай гісторыі супольна аб'яднаны, толькі трынаццаты – адшчапенец, злачынец Бонк.

Сям'я, паводле трапнага ўдакладнення Э. Ажэшкі, жыве ў «нізкай хаціне». Той хаты, дзе гадаваўся Ясік, якая ўтойвала сакрэты яго дзяцінства і якую яго вымусілі пакінуць, няма. Гаспадар Сымон Мікула перабудаваў старую хату, *«падлажыў новыя падваліны, выразаў большыя вокны»* [6, с. 28]. Але, нягледзячы на гэта, хата засталася нізкай, магчыма ад таго, што ўсе жыхары новага будынку жывуць з пачуццём пастаяннай павагі і страху перад суровым гаспадаром. *«Лёгка было здагадацца, што калі гэты стары ўстане на ўвесь рост і скажа свае слова, усе прысутныя паспешліва і старанна зробяць усё, што б ён ні загадаў»* [6, с. 19].

Э. Ажэшка як мастак аналітычнага складу імкнецца давесці чытачу думку, што такі суровы «дыктатарскі» стыль кіравання сям'ёй няправільны. Напрацягу ўсяго апавядання пісьменніца нагадвае, што ўсе Мікулы падобныя паміж сабой не толькі рыжаватым колерам іх валасоў, але і нейкай хуткасцю, дзёрзкасцю характараў, пра такіх кажуць, *«калі працуе, дык нібы той гарачы конь, а калі гуляе, дык рады не дасі…»* [6, с. 41]. З такой неўтаймаванасцю патрэбна абыходзіцца добразычліва і далікатна. На прыкладзе сям'і Мікулаў пісьменніца імкнецца адзначыць, што будучыня грамадства залежыць ад удумлівага і правільнага выхавання дзяцей.

Вобразам дзяцей у апавяданні «Зімовым вечарам» адводзіцца значнае месца. Яны прысутнічаюць у карцінах змрочнай сучаснасці і ў эпізодах шчаслівага мінулага, прадстаўленага ва ўспамінах галоўнага героя. *«Мардаценькае здаровае дзіцё ў кошыку ля ног маці»* [6, с. 15] сімвалізавала надзею на добрую будучыню. Вобраз ганарлівага падлетка, які як *«жарабя з развеянай грывай, падбягаў да братоў»* [6, с. 16] пазначаны прадчуваннем бяды. Пра яе гаворыць Бонк Хрысціне, папярэджвае маці, каб яна пільнавала Ясіка, каб той не стаў такім няшчасным як яго дзядзька.

Пастаянны клопат пра сваіх дзяцей, бясконцая памяць пра іх становіцца характарыстыкай духоўнай вартасці і дабрыні бацькоў. Добрай маці з'яўляецца нявестка Мікулаў – Аленка. У гутарцы з ёй Бонк даведаўся, што маладая жанчына некалькі месяцаў назад пахавала свайго маленькага сыночка Міколку: *«І яна ціхім напеўным голасам пачала расказваць, што некалькі месяцаў прайшло, як памёр яе старэйшы паўтарагадовы сынок. … Усе па ім плакалі, нават дзед, хоць ён такі суровы, плакаў. А потым забыліся, нават бацька родны забыўся. Адна толькі яна не можа забыцца. Буйная сляза пакацілася па яе поўнай ружовай шчацэ і, бліснуўшы, як брыльянт, упала на сінюю кофту»* [6, с. 52].

У пакутах маладой маці алюзійна адчувальны погляды Алёшы Карамазава. Герой славутага рамана Ф. М. Дастаеўскага адмаўляецца стаць архітэктарам «будынку лесу чалавечага», калі гэты фундамент будзе заснаваны на слязінцы аднаго толькі дзіцяці. Пагаджаючыся з думкамі славутага рускага пісьменніка, Э. Ажэшка верыла,

што сапраўдная гармонія ў грамадстве магчыма толькі ў тым выпадку, калі будуць шчаслівымі дзеці, калі іх смерць не будзе ўспрымацца як штодзённая радавая падзея ў сялянскім жыцці, а будзе пакутліва перажывацца як сапраўдная трагедыя і лічыцца недапушчальнай.

Дзеці і стаўленне да дзяцей у творы пісьменніцы – паказчык чалавечага ў чалавеку, мера чалавечай каштоўнасці. Прысутнасць дзіцячага ў паводзінах і характары дарослага чалавека сведчыць пра яго чысціню і дабрыню. Нават страшны злачынец Бонк у час аповеду пра свае ўцёкі з турмы пры дапамозе парасону «свяціўся амаль дзіцячай весялосцю» [7, с. 32]. Бонк расказаў, як узяў парасон, *«такі вялікі парасон, раскрыў яго, перавярнуў яго вось так і раз парасонам шусь праз вакно»* [6, с. 32]. *У час успамінаў «касцісты твар злачынцы напоўніўся гуллівай дзіцячай радасцю»* [4, с. 32]. Э. Ажэшка ўзвышае дзяцей, дзіцячае, але ўвесь час клапатліва нагадвае пра важнасць выхавання як гарманічнага працэсу ўзаемадзеяння бацькоў і іх выхаванцаў.

Мастацкая канцэпцыя выхавання ў творы пісьменніцы грунтуецца на біблейскай вобразнасці. Нездарма шлях злачынцы ідзе праз капліцу, дзе толькі зверху свяціліся два вакны, чалавек з чорным нутром напачатку зліваецца з цемрай, але *«тут жа каля яго грудзей, побач з сэрцам засвяціўся агеньчык ліхтарыка»* [6, с. 16]. Святло, якое быццам асвятляе жывое сэрца, жывую душу грэшніка і дае надзею на адраджэнне, таму што за ўсе грахі чалавецтва ўжо адпакутаваў распяты Хрыстос, цьмяныя абрысы яго (так сімвалічна і знакава) засталіся непашкоджанымі і добра бачнымі на запляснелых плямах сцяны капліцы: *«З драўлянага, выразанага няўмелай рукой распяцця вузкі і хісткі струменьчык святла перасунуўся крыху далей і асвяціў абраз, на якім Бог-айцец у хвалістым пурпуровым уборы трымаў руку на белым шары. Бог-сын у выцвілым блакіце ўзняў у гару два пальцы, а Бог-дух святы, распасцёршы крылы, белым голубам узлятаў пад чырвоную раму абраза»* [6, с. 17].

Як і ў біблейскай гісторыі, так і ў мастацкім творы Э. Ажэшкі «Бог існуе ў трох Асобах-іпастасях: Бог-Айцец (спрадвечны стваральнік Сусвету, яго духоўная сутнасць), Бог-Сын – Логас, яго абсалютны Сэнс, які ўвасобіўся ў Ісуса Хрыста) і Бог-Святы Дух – жыватворчы Пачатак, духоўная сутнасць усіх праяў касмічнага быцця (на вышэйшых (анельскім і людскім) узроўнях» [7, с. 131].

У мастацкім творы пісьменніцы згадка пра троіцу падаецца ў кантэксце праблемы выхавання, у кантэксце раскрыцця тэмы бацькоў і дзяцей. Бацька Сымон Мікула, паслядоўна пазнаючы ў страшным злачынцы свайго сына, успрыняў сынаву споведзь аб тым, чаму ён стаў страшным злачынцам, пагадзіўся з яго разуменнем жорсткасці свету і дараваў, даў шанс свайму дарослаому дзіцяці выправіцца, адпусціў на волю: «Ідзі, – сказаў ён, – ідзі. Хвіліну пазней ён закончыў: – І больш не грашы!». [7, с. 64]. Бонк-Ясік узрушаны ўчынкам бацькі, цалуе яго ногі. Так здзейсніўся момант глыбокага ўзаемадаравання.

Такім чынам, праведзенае даследаванне дае магчымасць адзначыць, што ў апавяданні «Зімовым вечарам» Э. Ажэшкі адбіліся гуманістычныя погляды пісьменніцы аб чалавеку як галоўнай каштоўнасці і адлюстраваны пры дапамозе ключавых вобразаў, катэгорый і прыёмаў мастацкай выразнасці: гульні святла і ценю, мастацкай анамастыкі (у якой выявілася трагічнае адлюстраванне рэчаіснасці і філасофія народнай мудрасці), пейзажных замалёвак і дэталяў партрэтаў, што сталі асновай унутранай цэласнасці мастацкага тэксту.

### Літаратура


1. *Гапава, В.* Шляхам праўды / В. Гапава // Ажэшка, Э. Выбранае. Апавяданні і аповесць. / Э. Ажэшка – Мінск : Мастацкая літаратура, 1975. – С. 3–10.
2. Идеи Гуманизма в русской литературе ХХ века / под ред. В. И. Фатющенко, Е. З. Цыбенко. – М. : Издательство Московского университета. 1993. – 160 с.
3. *Солдатенко, Т. Я.* Поэтика прозы Элизы Ожешко 80-х годов (белорусский цикл, роман «Над Неманом»): автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.04 / Т. Я. Солдатенко ; Академия наук Украинской ССР, Институт Литературы им. Т. Г. Шевченко. – Киев, 1964. – 24 с.
4. *Гапава, В.* Каралева жывога слова / В. Гапава // Ажэшка, Эліза Выбраныя творы / Э. Ажэшка; Уклад., прадм. і камент В. Гапавай – Мінск : Беларускі кнігазбор”, 2000. – 512 с.
5. *Навумовіч, У.* Прыцягальная сіла класікі. Аповесць «Хам» Элізы Ажэшкі / У. Навумовіч // Роднае слова. – 2008. – № 12. – С. 6–7.
6. *Ажэшка, Э.* Выбранае. Апавяданні і аповесць. / Э. Ажэшка – Мінск : Мастацкая літаратура, 1975. – 173 с.
7. *Завальнюк, У. М.* Энцыклапедычны слоўнік рэлігійнай лексікі беларускай мовы / У. М. Завальнюк, М. Р. Прыгодзіч, В. К. Раманцэвіч. – Мінск : Изд-во Гревцова, 2013. – 804 с.


### References


1. *Gapava, V.* Shlyaham praŭdy / V. Gapava // Azheshka, E. Vybranae. Apavyadanni i apovesc'. / E. Azheshka – Minsk : Mastackaya litaratura, 1975. – S. 3–10.
2. Idei Gumanizma v russkoj literature HH veka / pod red. V. I. Fatyushchenko, E. Z. Cybenko. – M. : Izdatel'stvo Moskovskogo universiteta. 1993. – 160 s.
3. *Soldatenko, T. Ya.* Poetika prozy Elizy Ozheshko 80-h godov (belorusskij cikl, roman «Nad Nemanom»): avtoref. dis. … kand. filol. nauk : 10.01.04 / T. Ya. Soldatenko ; Akademiya nauk Ukrainskoj SSR, Institut Literatury im. T. G. Shevchenko. – Kiev, 1964. – 24 s.
4. *Gapava, V.* Karaleva zhyvoga slova / V. Gapava // Azheshka, Eliza Vybranyya tvory / E. Azheshka; Uklad., pradm. i kament V. Gapavaj – Minsk : Belaruski knigazbor”, 2000. – 512 s.
5. *Navumovich, U.* Prycyagal'naya sila klasiki. Apovesc' «Ham» Elizy Azheshki / U. Navumovich // Rodnae slova. – 2008. – № 12. – S. 6–7.
6. *Azheshka, E.* Vybranae. Apavyadanni i apovesc'. / E. Azheshka – Minsk : Mastackaya litaratura, 1975. – 173 s.
7. *Zaval'nyuk, U. M.* Encyklapedychny sloŭnik religijnaj leksiki belaruskaj movy / U. M. Zaval'nyuk, M. R. Prygodzich, V. K. Ramancevich. – Minsk : Izd-vo Grevcova, 2013. – 804 s.